Кузьма, Д. І. Праблема выкарыстання гістарычнага вопыту ў працэсе фармулявання беларускай нацыянальнай ідэі / Д. І. Кузьма // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 283-285

**Д. І. КУЗЬМА (Мінск)**

# ПРАБЛЕМА ВЫКАРЫСТАННЯ ГІСТАРЫЧНАГА ВОПЫТУ Ў ПРАЦЭСЕ ФАРМУЛЯВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

Аніякая нацыя не можа пазітыўна развівацца без вызначэння сваёй нацыянальнай ідэі [4]. Працэс пошуку і крышталізацыі гэтай ідэі займае працяглы час — ад пачатку ўсведамлення сваёй непадобнасці на суседзяў да часу стварэння самастойнай нацыянальнай дзяржавы. Нацыянальная ідэя прадстаўляе сабой своеасаблівую праграму развіцця нацыі, у якой падкрэсліваюцца жыццёва вызначальныя для гэтай супольнасці паняцці, своеасаблівыя слупы, якія абапіраюцца на падмурак гістарычнага вопыту этнасу і пры гэтым пераходзяць у дах, даючы нам прадстаўленне аб накірунку развіцця супольнасці ў будучым.

Правёўшы аналіз прычын узнікнення нацыянальнай ідэі, можна выявіць шэраг найбольш важных функцый гэтага паняцця: 1) ідэнтыфікацыя нацыі сярод іншых; 2) кансалідацыя ў адзінай дзяржаве; 3) самаўзвялічванне; 4) вызначэнне накірунку далейшага развіцця.

Такім чынам, засяродзімся больш падрабязна на сувязі гістарычнага вопыту беларусаў з функцыянальнымі асаблівасцямі нацыянальнай ідэі. Ідэнтыфікацыйная функцыя. З дапамогай нацыянальнай ідэі народ ідэнтыфікуе сябе з пэўнай дзяржавай і нацыяй. У выніку буржуазных мадэрнізацый людзі пачынаюць усведамляць сваю непадобнасць на суседнія супольнасці. Ідэнтыфікацыя можа праходзщь праз аналіз свайго паходжання і месца ў этнічнай мапе свету, па моўнай прыкмеце, праз рэлігійную прыналежнасць і асаблівасці эканамічных структур.

Для беларусаў характэрна наяўнасць каталіцкага і праваслаўнага веравызнанняў, што ўдала выкарыстоўвалася суседнімі краінамі для ўсталявання нестабільнасці і расколу грамадства па рэлігійнай прыкмеце на праваслаўных рускіх і каталікоў палякаў [1]. З ліквідацыяй уніяцтва ў 1839 г. беларусам рэлігіі

для набажэнстваў ужо не заставалася, як перастала і выкарыстоўвацца падчас службаў беларуская мова.



Развіццё чыгункі, зносін, вялікія кірмашы, друк спрыялі больш цесным кантактам паміж рознымі часткамі краю і ўсведамленню беларускім насельніцтвам свайго падабенства, што яскрава праявілася ў выніках агульнарасійскага перапісу 1897 г., калі больш за 73 % насельніцтва беларускіх тэрыторый назвалі сваёй роднай мовай беларускую.

У другой палове XIX ст. беларусы ідэнтыфікуюць сябе як непадобны на рускіх і палякаў народ, а нацыянальная інтэлігенцыя даказвае, што беларусы маюць сваю непаўторную і адметную гісторыю, мову, менталітэт.

**Кансалідацыя**. Нацыянальная ідэя спрыяе кансалідацыі беларускага грамадства. Гістарычны вопыт даказвае, што беларусы маюць багаты вопыт жыцця ў поліэтнічнай супольнасці, што ў сваю чаргу развіла ў іх такую нацыянальную рысу, як талерантнасць — павагу да іншых культур і народаў. У свеце налічваецца толькі некалькі дзесяткаў монаэтнічных дзяржаў, а ўсім астатнім даводзіцца вырашаць праблемы сумеснага пражывання прадстаўнікоў розных этнасаў. Не ўсе дзяржавы могуць належным чынам вырашыць міжэтнічныя пытанні, што прыводзіць да грамадзянскіх войн, гвалту і этнічных чыстак.

Беларусы ж нармальна ставяцца да прадстаўнікоў іншых этнасаў, пражываючых на іх тэрыторыі, чаму спрыяе як адсутнасць гістарычна склаўшагася дамінуючага ўсведамлення нацыянальнай перавагі перад іншымі народамі, прыродная міралюбівасць, так і вопыт сумеснага пражывання і працы з татарамі, яўрэямі, рускімі, палякамі. Адсутнасць канфліктаў спрыяе кансалідацыі насельніцтва краіны на дзяржаўным і грамадскім узроўні, адсутнасць экстрэмісцкіх і фундаменталісцкіх рухаў [3].

**Самаўзвялічванне**. Кожная нацыя шукае ў гістарычным вопыце свайго развіцця найбольш значныя моманты, якія могуць служыць як прыклад праяўлення нацыянальных пачуццяў, патрыятызму, так і ў якасці пазітыўнага вопыту для новых пакаленняў грамадзян, дабіваючыся такім чынам пераемнасці гістарычнага развіцця. У сітуацыі з Беларуссю можна разглядаць, з боку стварэння ўмоў для паступальнага развіцця

беларускага этнасу, розныя дзяржаўныя структуры, якія існавалі на тэрыторыі нашай краіны ў розныя перыяды яе гісторыі.

Яшчэ адным важнейшым элементам стварэння прыцягальнага нацыянальнага вобраза з’яўляецца прыклад плённай дзейнасці нашых суайчыннікаў, якія ўдала абаранялі сваю зямлю, дасягнулі поспехаў у развіцці навукі і культуры [2].

**Накірунак развіцця**. Усвядоміўшы сваё месца сярод іншых народаў, багацце і значнасць нацыянальнай гісторыі, адзінства народа з дапамогай нацыянальнай ідэі беларусы могуць вызначыць і накірунак свайго далейшага развіцця, свае нацыянальныя прыярытэты. Пры гэтым неабходна ўлічваць і во-



пыт гістарычнага развіцця іншых краін, наступствы паспешлівых і непрадуманых палітычных рашэнняў, адбіраючы ў сваю чаргу толькі найбольш эфектыўныя і дзейсныя мадэлі развіцця. Таксама важным з’яўляецца і ўсебаковы аналіз сучаснага становішча дзяржавы і грамадства, каб арыентавацца, на аснове якога базісу будзе развівацца нацыя. У той жа час накірунак развіцця не павінен супярэчыць асноўным мэтам любой нацыі — перш за ўсё самазахаванню, імкненню да дабрабыту і развіцця.

**Высновы**. Нацыянальная ідэя — важнейшае паняцце для развіцця любой нацыі, яна прадстаўляе сабой своеасаблівую праграму, без якой рух наперад вельмі праблематычны. Нацыянальная ідэя, як нацыянальная ідэнтычнасць, дапамагае народу ўсвядоміць сваё месца ў свеце і на аснове гістарычнага вопыту растлумачыць асаблівасці палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага становішча.

## ЛІТАРАТУРА

1. Астапенка, А. Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце / А. Астапенка. Мінск, 2003.
2. Бобков, В. А. К вопросу о белорусской национальной идее / В. А. Бобков. Мінск, 2003.
3. Мельник, В. А. Белорусская идея и национальная государственность / В. А.Мельник. Мінск, 2003.
4. Слука, А. Г. Нацыянальная ідэя / А. Г. Слука. Мінск, 2001.